праследаванне людзей, тапленне, зашмальцоўванне козытам, псаванне пасеваў і г. д. Па матэрыялах паўднёварускіх павер'яў, русалкі насыпаюць на палі буры, ліўні, град; там, дзе яны бегалі і гарэзавалі, трава расце гушчэй і зеляней, і там хлеб народзіцца багацей.

Быў разгледзены абрад "Правады русалкі". У гэтым абрадзе русалку "палілі", "тапілі", "закупоўвалі" на могілках, "праганялі" і "хавалі". Былі выяўлены формы і атрыбуты пераапранання, такія як вянкі і іншая зеляніна. Дзяўчаты апраналі белую вопратку або былі паўаголены, некаторых апраналі ва ўборы нявесты.

**Практычнае прымяненне атрыманых рэзультатаў.** Практычная значнасць працы заключаецца ў тым, што матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні на занятках па міфалогіі ў ВНУ, а таксама пры падрыхтоўцы да факультатыўных заняткаў у ВНУ і школах, гімназіях, ліцэях.

## СЕМАНТЫКА-СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЧУЖОГА МАЎЛЕННЯ Ў "ПАЛЕСКАЙ ХРОНІЦЫ" І. МЕЛЕЖА

*К. П. Маслаў (студэнт I курса)*

**Праблематыка.** У беларускім мовазнаўстве распрацоўкай метадалогіі лінгвааналізу мастацкіх тэкстаў займаліся Ф. М. Янкоўскі, Т. М. Малажай, У. П. Лепешаў, М. В. Абабурка і многія іншыя, чые імёны вядомыя далёка за межамі краіны. Аднак вывучэнне мастацкіх твораў вельмі часта абмяжоўвалася аналізам вобразна-выяўленчых лексічных сродкаў. Семантыка-стылістычныя асаблівасці мовы пісьменнікаў заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў, таму сёння навукова-запатрабаванымі з'яўляюцца распрацоўкі аднаго з самых складаных пытаннях сучаснага мовазнаўства – вывучэнне суб'ектыўнай мадальнасці мовы мастацкіх твораў і стылю пісьменнікаў на семантыка-сінтаксічным узроўні, што абумоўлена каштоўнасцю іх вынікаў. У нашай працы мы звяртаемся да вызначэння суб'ектыўнай мадальнасці мовы мележаўскіх твораў,да вызначэння дадатковых значэнняў, звязаных з перадачай адносін моўцы, да таго, што ён гаворыць.

**Мэта даследавання.** Вызначыць семантыка-стылістычныя асаблівасці выкарыстання чужой мовы ў творах І. Мележа; выявіць спосабы выражэння (суб'ектыўную мадальнасць) чужога маўлення ў "Палескай хроніцы" І. Мележа; вызначыць тэматычныя групы выражэння выказніка ў словах аўтара; вызначыць месца і акрэсліць ролю пісьменніка ў развіцці беларускай літаратурнай мовы.

**Аб'ект даследавання** – "Палеская хроніка" І. Мележа, **прадмет** даследавання – чужая мова.

**Выкарыстаныя методыкі**. Мэты і задачы працы абумовілі выбар метаду лінгвістычнага апісання ў якасці асноўнага.

**Навуковая навізна** і каштоўнасць вынікае з аналізу чужой мовы твора "Палеская хроніка" І. Мележа.

**Атрыманыя навуковыя вынікі.** Аналіз фактычнага матэрыялу паказвае, што ў "Палескай хроніцы" Івана Мележа выкарыстанне чужой мовы мае свае

асаблівасці. Так, напрыклад, словы аўтара ўводзяцца разнастайнымі паводле семантыкі дзеясловамі-выказнікамі, у склад якіх уваходзяць і фразеалагізмы, што выступаюць сінонімамі да дзеясловаў маўлення. Выкарыстанне розных відаў чужога маўлення ўзаемазвязана і ўзаемаабумоўлена ідэйным зместам твора.

**Практычнае прымяненне атрыманых вынікаў**. Спадчына мастака слова дае магчымасць пашырыць веды аб разнавіднасці творчых пошукаў пісьменніка, яго грамадскай дзейнасці, аб узорным выкарыстанні слова ў якасці вялікай сілы ўздзеяння на чытыча і слухача. Даследаваны матэрыял дапаможа прасачыць асаблівасці развіцця літаратурнай мовы беларускага народа, а таксама ўбачыць перспектывы яе будучага развіцця.

## ВИЗУАЛИЗАЦИЯ ИНФОРМАЦИИ В ПРОФОРИЕНТАЦИОННОЙ РАБОТЕ ВУЗА

*В. Ю. Грицук (студент II курса)*

**Проблематика.** Данная работа направлена на исследование различных видов теоретических подходов реальных ситуаций педагогической действительности по проведению профориентационных мероприятий среди школьников в общеобразовательных учреждениях. Проблема профориентации в условиях общеобразовательной и профессиональной школы на современном этапе ее развития требует обеспечения планомерного ее проведения, координации действий государственных органов, школы, семьи, общественности и других социальных институтов, участвующих в ее решении, разграничения функций между ними, непрерывного и своевременного решения научных и организационных вопросов.

**Цель работы.** Рассмотреть особенности использования технологии визуализации в работе по профориентации со старшеклассниками.

**Использованные методики.** Используя технологии визуализации в профориентационной работе, можно решить целый комплекс педагогических задач: увеличить рост интенсивности обучения, повысить учебно-познавательную деятельность, развить визуальное мышление, представление знаний и практических навыков, передачу знаний и образов, повышение грамотности и культуры.

**Научная новизна.** Изучение роли визуализации в профориентационной работе со школьниками. Исследование профессиональной направленности старшеклассников, а также использование технологии визуализации в профориентационной работе со старшеклассниками.

**Полученные научные результаты и выводы.** В условиях новых рыночных отношений актуальность профориентации возрастает: повышается потребность личности в оптимальном профессиональном самоопределении, рынок диктует новые требования к подготовке и переподготовке кадров и все это на фоне формирующегося перспективного плана экономического развития Беларуси, отсутствия действенного механизма координации развития различных отраслей, регионов, предприятий и организаций. В определении места и роли профориентации в профессиональном самоопределении учащейся молодежи необходимо исходить из того, что профориентационная работа предполагает